Самапомач
Samapomač

Беларуская Коопэратыўна-Гаспадарчая Часопісь

Год I. | Вільня, Сьнежань 1932 г. | № 3.


Хай злыдні над намі
скрыгочуць зубамі,
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй
засявай!..

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомаччу

Джордж РЭССЭЛЬ.
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ ГАДАВІКА «САМАПОМАЧЫ» ЗА 1932 г.

BIEŁARUSKAJA ABECEDA.

Беларуская абэцэда.

A, a — А, а.	H, h — Г, г.	Ł ł, — Л, л.	S, š — Ш, ш.
B, b — Б, б.	Ch, ch — Х, х.	M, m — М, м.	T, t — Т, т.
C, c — Ц, ц.	I, i — І, і.	N, n — Н, н.	U, u — У у.
Ć, ć — ЦЬ, ць.	J, j — Й, й.	Ń, ń — НЬ, нь.	Ŭ, ŭ — Ў, ў.
Č, č — Ч, ч.	Ja, ja — Я, я.	O, o — О, о.	V, v — В, в.
D, d, — Д, д.	Je, je — Е, е.	P, p — П, п.	У, у — Ы, ы.
E, e — Э, э.	Ju, ju — Ю, ю	R, r — Р, р.	Z, z — З, з.
F, f — Ф, ф.	K, k — К, к.	S, s — С, с	Ž, ž — Ж, ж.
G, g — Г, г.	L, l — ЛЬ, ль.	Ś, ś — СЬ, сь.	Ź ź — ЗЬ, зь.

SAMAPOMAČ

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŪNA-HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres redakcyi i administracyi: Vilnia, Połackaja vul. 4—10.

Hod I.	Vilnia, Śniežań 1932 h.	Nr. 3.

NA DALŠUJU METU.

Nia raz i nia dva treba budzie jšče viarnucca da vyjaśnieńnia asnaŭnych pytańniaŭ kooperatyŭnaj samapomačy: robim heta pieradusim z uvahi na zapatrebavańnie pačynajučych bieł. kooperatystaŭ — r e d.

Nadasłanyja piśmy i hutarki z padpiščykami-čytačami „Samapomačy“ pazvalajuć ćvierdzić, što časopiś naša trapiła ŭ „žyvoje“ narodnych „huščaŭ“. Jany śviedčać, što ŭ nas jošć šmat užo intelihiencyi i „šeraha“ sialanstva, jakija naležna razumiejuć značeńnie i mahčymaści kooperacyi. Z druhoha boku ŭznoŭ — nia majem prava maŭčać — nia mała jošć jašče i takich, katoryja zaraz-ža chacieli-b z kooperacyi zrabić „słužku da ŭsiaho“: adzin chacieŭ-by, kab kooperatyŭnaja časopiś davała bolš miejsca praktyčnym radam z haliny ziemlarobstva, inšyja — handlu, jašče inšyja — damovaj pracy, ramieśnictvu i h. d. A jošć i takija, što chacieli-b chiba, kab „Samapomač“ stałasia ...„Małankaj“ i źmiaščała „śmiešnyja vieršyki“. — I jak-ža tut usim dahadzić?—

Prysłuchoŭvujemsia i cenim hołas našych čytačoŭ, ale adnačasna nia robim, nia možam rabić sabie z hetaha kumira (bažka), jakomu niechta mieŭ-by kłaniacca. Naadvarot, musim i majem svaju **puciavodnuju dumku**, za jakoj idziom sami i achvotnych za saboj kličam. Ab hetaj dumcy pisali my anahdaj (*Samapomač Nr. 1*) i tut paŭtarajem jaje ŭ dvuch tolki słovach: **kooperatyŭnaje ŭśviedamleńnie.** Dla hetaje mety założana „Samapomač“ i jej pieradusim maje służyć. Usie-ž inšyja pytańni majuć u joj miejsca tolki druharadnaje i źmiaščajucca abo tolki jak dapamoha da zrazumieńnia dumki hałoŭnaj, abo časova tolki karystajuć z „prava haścinnaści“, pokul nie dačakajucca svajho sobskaha dru kavanaha orhanu. — Dziela hetaha nia možam pryniać pad uvahu ŭsie pažadańni n i e - k o o p e r a t y ŭ n y j a.

Što-ž datyča metodyki raźbirańnia i tłumačeńnia pytańniaŭ kooperatyŭnych, dyk asnaŭnym praviłam dla nas jošć **evolucyjny** postup arhaničnaha budaŭnictva. Heta znača, što, chočačy pryhatović biełaruskaje pole pad kooperacyju, uvažajem za biazumoŭna kaniešnaje pačynać ad najmienšaha, usio samym pieražyć, pierapracavać i ničoha nie prapuskać.

Asnovaj ci padstavaj, fundamentam kooperatyŭnaha budaŭnictva jošć nia što inšaje, jak tolki ludzkaja duša, sam **čałaviek**, katoraha treba vychavać na śviedamaha kooperatara. Šlacham da hetaha pavinna być nie paturańnie ludzkim słabaściam, nie tandetnaje „pamahańnie biedavać“, ale śmiełaje nazyvańnie pa imieńniu hetych słabaściaŭ i pakazańnie na sposaby, jakimi ich možna i treba piera mahčy.

Kooperatyŭnaje ŭśviedamleńnie našaha čałavieka — heta ideał, da katoraha treba jšci pastupova, prabudžajučy i zamacoŭvujučy ŭ dušy hetaha-ž čałavieka pačućci ludzkaści i hramadzkaści. Inšymi słovami, prad tym jak być kooperataram, treba być **čałaviekam** i **hramadzianinam** u poŭnym hetych słovaŭ značeńni.

Vialikaja heta i važnaja sprava. Bo jak ni charošy, ci i prosta cudoŭny płod kooperatyŭnaj samapomačy, to-ž jon adnak niemahčymy ŭsiudy tam, hdzie prad im nie praarana była barazna ŭśviedamleńnia taho, što na biazvolnych i zapužanych ludziach, nia viedajučych, chto jany i pašto žyvuć, kooperacyja apiercisia, a tymbolš raźvivacca i prynasić płady nia moža: na heta patrebna zrazumieńnie **ludzkoj hodnaści i hramadzkaj samabytnaści**. I tut pieradusim jošć pryčyna, čamu bolšaść kooperatyvaŭ u našym krai pierastała pracavać i isnavać jakraz tady, kali biada akazałasia najbolšaj i pomač — najpatrabniejšaj: stałasia z hetymi kooperatyvami hetak dziela taho, što jany nia mieli svaich noh, svaich padstavaŭ, nia mieli śviadomaha materyjału ludzkoha i tymbolš hramadzkaha. Bolš taho: čužyja zakładčyki i haspadary „našych“ kooperatyvaŭ sumyśla vyminali našych śviadomych ludziej, kab hetyja im „nia škodzili“ i budavali „kooperatyvy“ na roznych padlizach, kuplenych „za chleb“. Tymčasam usio heta ŭpała, bo koopecyja heta takaja reč, jakuju ani na hra-

šoch, ani na palicejskich nakazach budavać nia možna: jaje budavać treba tolki na ludzkoj i hramadzkaj śviedamaści.

Čałaviek-asoba heta vialikaja siła, ale tolki čałaviek-hramadzianin moža być siłaj karysnaj. Čałaviek, što svaje siły i zdolnaści nakiroŭvuje tolki na zdavaleńnie svaich asabistych, vuzkich patrebaŭ, nia jość jašče čałaviekam celym. Ludzkija patreby vybiahajuć daloka za asabistyja siły, a dziela taho i ludzkaja čynnaść, praca, nia moža ahraničycca tolki da ŭłasnaj asoby. Inšymi słovami čałaviek-asoba, u svaim-ža sobskim intaresie, musić łučycca da pracy z svaim susiedam, musić dabravolna ahraničyć i padparadkavać svaju volu, voli hetych-ža susiedziaŭ, kab samomu karystacca z ichnaj-ža pracy i voli. Hetkaje dabravolnaje ahraničeńnie i ščeplivańnie intaresaŭ čałavieka-asoby, z takimi-ž intaresami jahonych bližnich, vyhadoŭvuje byccam novaha, bolš cennaha, kazaŭ-by rasovaha čałavieka, znajučaha nia tolki akiałzać svaje patreby i pažadańni, ale zdolnaha adčuć i adkliknucca na patreby bližniaha. Čałavieka hetkaha nazyvajuć čałaviekam-hramadzianinam. Zhetul užo tolki krok da ŭśviedamleńnia kooperatyŭnaha, da **čałavieka-kooperatara**.

Hetkim paradkam tolki ŭzhadavany čałaviek jość niaźniščalnym fundamentam tryvałkaj kooperatyŭnaj samapomačy i hetkaje ŭzhadavańnie stavim sabie jak pieršaje z pieršych našych zadańniaŭ. Nia lohkaje jano, ale kaniešnaje, kali naahuł dumajem niekali pačać žyć jak ludzi, a nie jak biazładnaje i biazimiennaje stada, jak žyviom dahetul. Treba ŭjavić sabie, što na hetkuju spravu patrebny nia dzień, ci dva, a celyja hady. Dziela hetaha i praca nia moža być lohkaj, a vyniki — skorymi: dačakajecca i skarystaje z ich toj, chto budzie vytryvałym. Zapasu-ž vytryvałaści na pracu haspadarčuju ŭ nas nikoli nia moža być za šmat, bo paniaćci ab joj u nas paplutany na hetulki, što prastupak nazyvajecca cnotaj, a cnota — prastupkam (prykład: žyćcio nad stan — aščadnaść).

Da hetaha pytańnia jšče vierniemsia. Tut-ža na kančatak zaznačym, što namiečanym šlacham nie daraznaj (skoraj) karyści, ale pracy raźličanaj na daŭžejšy čas pojdziem dalej. Ružovych ściežak pierad saboj nia bačym, heta praŭda. Ale tymbolšy abaviazak dla kožnaha nia ŭstupać prad pieraškodami, za katorymi, raniej ci paźniej, ale **pieramoha peŭnaja**. U hetu darohu kličam usich ludziej dobraj voli; i to siahońnia, zaraz-ža, kali ciemra badaj najbolšaja i sił treba najmacniejšych. Bo zaŭtra pomač moža być niepatrebnaj.

Дарма добрай газэты не спадзявайся!

Прышлі грошы на падпіску на „САМАПОМАЧ“!

Я. Косаўскі.

(3)

Для бліжніх.

Драма ў 4-ох дзеях.

(З украінскай на беларускую мову тлумачыла Г. Ш.)

ДЗЕЯ II.

(Сенажаць. Пакосы сьвежа выкашанай травы, вольная ваколіца. Вечарэе).

ЗЬЯВА I.

(Грамада хлапцоў і дзяўчат. Паміж імі Аляксей і Рыгор. Адны сядзяць на пакосах, другія стаяць з косамі, граблямі ды віламі).

Рыгор (*гукае за кулісамі направа*): Эй там, скарэй, Грыпіна-а-а! Ты й да рана не прыбярэшся.

I Парабак: Пацярпі, яна йшчэ не пазьбірала ўсіх жаб. А пакуль іх пазаганяе спаць, дык і сонца ўзойдзе з-за Ахрэмавага гумна. (*Сьмех*).

Ксеня: Дый сапраўды, што яна там копшкаецца (капаецца). Праз адну ўсе чакаюць. Да хаты ўжо пара даўно.

Аляксей: Ды чаго гэта вы прычапіліся да дзяўчыны? Яна пэўна кмін зьбірае. Ці-ж ня лепш тут пасядзець, ды пасьпяваць на сенажаці? Зараз месяц узойдзе з-за вёскі. Здаецца, што цэлую ноч тут-бы праседзіў.

Ксеня (*Павірае на Аляксея*): Эгэ, ды табе тут весела пасядзець і пачакаць, ці ня выйдзе дзяўчынка з блізкае хаты...

Аляксей: Ды якая там дзяўчына!

Ксеня: А твая Насьценька!

Аляксей: І чаго вы ўсе мне Насьцяй дакараеце? Хі ж ня ведаеце, што я ёй не раўня? — Бо-ж „якая грэбля, такі стаў“ — кажуць. У Насьці багацьце, коні, каровы, ей за першага багача замуж ісьці, ды не за мяне, што на заработках чужое кашу сена...

Ксеня: Э, знаемо. Няма на сьвеце такога, каторы-б адразу прызнаваўся ў каханьні. Ды яшчэ Аляксей! А тут і не агледзішся, як у цэркве прачытаюць запаведзі, ды йшчэ і тады „не хачу і ня ведаю.“ —

Грыпіна (*нясе вязку кміну*): Ну вось і я! Гукалі, гукалі, думалі, што я ўтапілася. Хіба-ж вам так да дому карціць!

I Парабак: Я ўжо думаў, што ты там заначуеш.

Грыпіна: А што-ж думаеш, спалохалася-б?!.. Ня страхава дачка!

I Парабак (*глядзіць ёй пад ногі*): Ды ты жабу натаптала!

Грыпіна (*адскочыўшы*): Ай-яй!...

25-ciłećcie ukrainskaha „Masłosojuzu“.

(*Zamiest pryvitańnia*).

Sioletni hod jość jubilejnym hodam „Masłosojuzu“ — sapraŭdnaj hordaści i słavy sučasnaj ukrainskaj kooperacyi na zach.-ukrainskich ziemlach: sioleta minuła 25 hadoŭ času ad taho dnia, kali (26.IX. 1907 h.) ŭ pavietavym halickim mieście Stryj'u było zasnovana „T-vo Krajevyj Sojuz Hospodarśko-Mołočarśkyj“, z katoraha raźviŭsia siańniašni „Masłosojuz“. — Ukrainskija kooperatary hety jubilej nалežna adśviatkavali ŭ dzień 13 h. m., kali byŭ paśviačany novy sobski budynak „Masłasajuzu“ u Lvovie pry vul. B. Głowackaha 23. — Naša redakcyja, budučy zaprošanaj pryniać učaście ŭ hetym śviatkavańni i nia mohučy vysłać tudy svajho pradstaŭnika z pryčyn techničnych, zmušana była ahraničycca da pasłańnia jubilejnaha pryvitańnia. Na hetym-ža miejscy pazvalajem sabie vyrazić pažadańnie, kab „Masłasajuz“ i nadalej pracavaŭ na karyść i słavu sobskaha Narodu ukrainskaha i dla navočnaj navuki budziačajsia kooperacyi biełaruskaj!

Red.

* * *

Čym jość ukrainski „Krajevyj Mołočarśkyj Sojuz, koop. z obm. vidpovidalnistiu „Masłosojuz“ u Stryju“, — toj tolki moža sabie ŭciamić, chto pracu „Masłasajuzu“ bačyŭ. Na słovach-ža možna było-b jaho nazvać prykładam systematyčnaj, vytryvałaj pracy ad samych asnovaŭ da siańniešniaj bujnaści, prykładam pracy arhaničnaj. „Masłasajuz“ nie naradziŭsia takim silnym, jakim siahońnia jaho bačym. Nie! Pieršaj jahonaj kletkaj była drobnaja viaskovaja małačarnia ŭ siale Zavadovie, adčynienaja starańniem Stryjskaha Addziełu kult.-praśv. t-va „Prosvita“. Zapačatkavany razrost ukr. małačarstva źniščyła adnak vajna. Mała rabiłasia i ciesna paśla vajny až da 1923 h., kali ŭ m. Stanisłavovie padajuć sabie ruki da niazmoranaj pracy maładyja biezkarysnyja pracaŭniki, jakija, zamiest „šukać pasady“ pa skančeńni škołaŭ, pastanavili varstat pracy stvaryć. I sapraŭdy stvaryli, a ludziej — sialan vyrvali z abojmaŭ spekulanskaha pachciarstva.—Jaki pavučalny prykład dla intelihiencyi biełaruskaj!

Jak šybka raźvivałasia praca adbudavanaha paślavajennaha „Masłasajuzu“, chaj śviedčać hetyja cyfry:

U 1924 h. „Masłasajuz“ abjednyvaŭ užo 39 małačarniaŭ z dastavaj 91.518 kg masła i ŭ 1931 h. toj-ža „Masłasajuz“ mieŭ užo 249 siabraŭ-małačarniaŭ, jakija dastavili na prodaž u „Masłasajuz“ 2.428.012 kg. masła. Zahranicu vyviez „Masłasajuz“ u 1926 h. 48.472 kg. masła, a ŭ 1931 h. — 841.799 kg. Dla pieravozki masła ŭ kraju „Masłasajuz“ maje 9 aŭtamabilaŭ, a handlovyja abaroty „M-zu“ za 1931 h. vynosili 14.696.933. zł. Ludziej zaniatych pry

---

І Парабак: Ды не! Я толькі хацеў даведацца, якая ты храбрая (*сьмех*).

Аляксей: Давайце, засьпяваем. Такая ноч, што песьня аж вырываецца з горла (*Сьпяваюць**).

Гэй ты Нёман, рака!
Ці ты думаў, ці сьніў,
Як сьлязу мужыка,
Ў свае воды лавіў?
Як стаяў над табой
Сын нядолі худы
І над соннай вадой
Сьпяваў песьні нуды.
Што надыйдзе пара
Зьнемажэньне міне
Адраджэньня зара
Над народам блісьне.
Што з балючых грудзей
Беларусі дзяцей
Над табой загудзе
Песьня вольных людзей?

Грыпіна: Ой, як тут прыгожа сьпяваецца. Адкуль той голас сам вырастае.

Ксеня: Гэта так з расою.

Рыгор: А ведаеце што, дзяўчаты: калі хочаце, то пайду на хутар і папрашу гэнага вялікага чаўна. Паплывем туды за заварот. Там яшчэ весялей.

*) З дазволу аўтора падстаўляем песьні беларускія.

Ксеня: Ідзі проч. Ты нас завёз-бы ня ведама куды і табе было-б весела.

Рыгор: А-ей, хто-б там цябе шкадаваў, калі-б нават гдзе ў калтобіну ўвалілася.

Ксеня: Знайшліся-б добрыя людзі. Але такім, як ты, дык гдзе-ж там шкадаваць!

Рыгор: Ды і без аднэй, ды яшчэ куртатай ёсьць на сьвеце многа сарок.

Ксеня: Дам я табе за куртатую сароку (*бяжыць за ім з граблямі і хоча ўдарыць*).

Рыгор (*Уцякае, хаваючыся за іншых, перабягае то туды, то сюды, урэшце хапае за граблі і прыцягівае да сябе Ксеню*): А пакажы, які ў цябе дзюб (*цалуе Ксеню*).

Ксеня (*вырываецца*): Пусьці, бо як цябе ўдзюбну, то вока падпухне (*вырываецца і ўцякае*).

Рыгор (*выцірае шчаку і глядзіць на пальцы*). Сапраўды тыкі ўдзюбнула. (*Дзяўчаты сьмяюцца*).

І Парабак: Ня бойся. Гэта толькі сьліна. Ксеня заўсяды так, як цалуе.

Ксеня: Сам сьлінка, дык думаеш, што ўсе такія.

ЗЬЯВА 2.

(*З хутара праз кладку йдзе Трахім*).

Рыгор: А вось і Трахім. А ну каторую ўпадабае?

Praca ŭ niamieckich spažyvieckich kooperatyvach.

Dla adradžajuščajsia biełaruskaj kooperacyi maje vialikaje praktyčnaje značeńnie abznajomleńnie z usim tym, što karysnaha robicca ŭ inšych narodaŭ supolnymi vysiłkami samych pracoŭnych masaŭ.

Navat i ŭ tym vypadku, kab nam, z pryčyny našaj hality — mnohaha nie dałosia-b zastasavać u žyćci z taho, što nahladajecca ciapier u Niamieččynie, — va ŭsialakim vypadku my pavinny viedać, što moža zrabić samadziejalnaść pracoŭnych masaŭ, abjadnanych ducham salidarnaści. Vyniki hetaj samadziejnaści z asablivaju jaskravaściu kidajucca ŭ vočy, kali paraŭnać sučasny stan niamieckaj kooperacyi z stanam jaje ŭ tyja časy, kali pieršym jaje zakładčykam prychodziłasia staŭlać pieršyja kroki, pry niaprychilnym u toj čas niamieckim zakonadaŭstvie da kooperacyi, — amal nielehalna... Ciapier adnak kooperacyja ŭ Niamieččynie vyjaŭlaje z siabie ŭžo takuju siłu, z katoraj ličycca ŭsio hramadzianstva i ŭrad.

Pryhledzimsia bližej da niamieckaj kooperacyi.

Pajščyki.

Kožny darosły, nieahraničany ŭ pravoch hramadzianin, moža być, zhodna z siańniašnim niamieckim zakonadaŭstvam, siabram kooperatyvy. U siabry pryjmajucca i asoby praŭnyja (arhanizacyi). Kožny siabra pavinien unieści ustupnuju płatu ŭ raźmiery ad $^1/_2$ da 1 marki i paj.

Dziela taje pryčyny, što niamieckaja kooperacyja nia maje adzinaha, ustanoŭlenaha kooperatyŭnym zakonam, paja — dyk vieličynia jaho vahajecca ŭ roznych kooperatyvach ad 30-cioch marak da 50-cioch. Na 1 studzienia 1928 h. tolki ŭ 14 kooperatyvach paj pieravyšaŭ 50 marak. U tym vypadku, kali spravy kooperatyvy pojduć niaŭdačna i jana zrobicca, naprykład, niepłatazdolnaj, tady kožny siabra jaho tracić svoj pajavy ŭznos i, akramia taho, adkazvaje ŭ raźmiery paja, h. zn. u sumie ad 30 da 50 marak, — i tolki.

Treba jašče zaŭvažyć, što pajavy ŭznos pry zapisu ŭ siabry nia ŭzyskivajecca. Kožny novy siabra płacić na rachunak paja tolki $^1/_2$ marki, pry hetym niezamožnyja zusim zvalniajucca ad hetaha abaviazku.

Svoj paj kožny siabra źbiraje ŭ samaj kooperatyvie.

Pa svajoj achvocie jon moža ŭnasić u kooperatyvu na rachunak pajavoha ŭznosu

---

hetym było: 111 vyšejšych i nižejšych uradaŭcaŭ i 44 rabotniki.

Heta suchija cyfry. Ale jany nia niemyja: jany pakazvajuć, što sapraŭdny narodny kapitał heta nia tolki hrošy, ale i svaja razumnaja narodnaja intelihiencyja.

Hetkich sapraŭdnych intelihientaŭ treba nam Biełarusam jaknajbolš. *A. K.*

Трахім (*Пaдходзе бліжэй*): Добры вечар! Я думаў, што вы нанач выйшлі на сена.

Ксеня: Не, Трахім. Мы тут цябе чакаем цэлы дзень.

Трахім (*не дачуўшы*): Га? Жадаеце? Ад каго?

Ксеня (*нахіляецца да яго вуха*): Цябе чакаем.

Трахім: Ага! А навошта-ж я вам?

Ксеня: Грыпіна па табе сумавала.

Трахім: Га? Скавытала, кажаш? Хто? (*Усе сьмяюцца*).

Ксеня (*Голасна*): Па табе сумуе Гры-піна!

Трахім: Жартуйце сабе. Куды мне да Грыпіны.

І Парабак: Чаму не. Ты трохі глухаваты, а яна крыклівая — самы раз пара.

Грыпіна: А ты дурны — самы раз дружба.

Трахім: Служба? Служба? Я праз гэта й не жанюся, што цяжкая служба! (*Усе сьмяюцца*).

Ксеня: Ну ўжо годзі. Перастаньце сьмяяцца з Трахіма (*да Трахіма голасна*): Што там чуваць, Трахім?

Трахім (*Адыходзе в Аляксеем ў бок і штось яму гавора*).

І Парабак: Ну, пара да дому, Зара нам прынясуць вячэру,

Усе: А й сапраўды. Ужо позна. Пойдзем (*Выходзяць сьпяваючы. Астаецца Трахім, Аляксей і Рыгор*)

Ой у лесе, пры даліне
У нас сталася бяда,
Гэй, гэй, ў лесе, ў лесе
У нас сталася бяда.
Пры даліне, у гушчары
Калыхаліся камары,
Гэй, гэй. . . .
Дуб да дуба пахіліўся
Камар наш з дуба зваліўся
Гэй, гэй, ў лесе...

Трахім: (*ідзе назад у хутар*)

Рыгор (*да Аляксея*): Ну, бяры, касу, пойдзем... А што табе казаў Трахім?

Аляксей (*задуманы*): Клічаць на хутар.

Рыгор: Ну, дык ідзі! Пойдзеш?

Аляксей: Ня ведаю!... Пасядзім яшчэ крыху. (*Сядаюць*)

Рыгор: Ну і як ты думаеш? Выйдзе што з гэтага? Мала часу... а ў нас ня вельмі ясна... Спачатку я рахаваў на старэйшых гаспадароў, ды — гэтых штось ня многа...І калі той народ прачнецца?

Аляксей: Будзе ўсё добра! Толькі ня трэба гарачыцца!

Рыгор: Аляксей, як я з табой, то маю надзею, а як астануся сам — прызнаю-

jakuju choča sumu i kali choča, a navat i zusim nia ŭnosić. U hetym apošnim vypadku žbirańnie paja ŭsiož-taki jdzie šlacham zatrymańnia z pajščyka tych premijaŭ, katoryja należać jamu za nabrany ŭ kramie tavar.

U bolšaści niamieckich kooperatyvaŭ nie vydajuć na ruki premii za nabor da taje pary, pakul poŭnaściu nia budzie pakryta jaho zadoŭžanaść pa pajavomu ŭznosu. Niekatoryja-ž kooperatyvy ahraničvajucca ŭtrymańniem tolki častki premii, vydajučy reštu naležnaj sumy na ruki siabru. Hetak unosić svaje pai ahramadnaja bolšaść siabroŭ niamieckich kooperatyvaŭ.

Zusim zrazumieła, što pry hetkim paradku dźviery kooperacyi šyraka razčynieny navat dla samych niezamožnych ludziej.

Stasoŭna da našych umovaŭ žyćcia, u tych vypadkach, dzie arhanizatary kooperatyvy mahli-b atrymać ci-to tavarovy, ci-to hrašovy kredyt, — hetaki sposab uzyskańnia pajoŭ možna ličyć vielmi metaadpaviednym, pryjmajučy pad uvahu trudnaści dla našaha sialanstva „vycisnuć“ patrebnuju załatoŭku na pajevy ŭznos. Dobry hetaki sposab i na toj vypadak, kali žycharstva naahuł niedavierčyva paziraje na ŭsiakuju novuju spravu, a ŭ tym liku i na kooperacyju.*)

*) Pieradajučy lojalna dumku Pavažanaha Aŭtora, nia možam nia vykazać na hetym miejscy dźviuch zaściaroHaŭ: 1. dla biełaruskaha pajščyka susiom čužoje paniaćcie spažyvieckaj kooperatyvy, jak instytucyi aščadnickaj i kooperatyva, jakaja chacieła-b hetak („paniamiecku“) ściahivać u nas pajevyja ŭznosy badaj nikoli nie razžyłasia-b na patrebnyja abarotnyja fondy. 2. Najnaviejšy kirunak u suśvietnaj i niamieckaj! — kooperacyi heta kasavańnie ŭsiakich kredytaŭ. — red.

Treba zaŭvažyć, što ŭ niamieckaj kooperacyi pajavyja kapitały majuć davoli słabuju rol, a patrebnyja da abarotu składki kooperatyvy majuć tam z kredytnych układaŭ svaich pajščykaŭ, ab čym budzie hutarka dalej.

Cikava, miž inšym, što stary zakon, pavodle jakoha ŭ kooperatyŭnych kramach tavar moža pradavacca tolki siabrom kooperatyvy— utrymaŭsia da siańniašniaha dnia i pradaža asobam pastaronnim zabaroniena. Kooperatary proci takoha zakonu ničoha nia majuć, bo jon kooperatyŭnamu ruchu prynosić ciapier tolki karyść, vychoŭvujučy ŭ siabroŭ dyscyplinu i zacikaŭleńnie da spraŭ kooperacyi.

Niamieckija kooperatyvy susim słušna pryznajuć, što, kab „pryviazać“ pajščyka da kooperatyvy — adnaho idealizmu mała, nieabchodna zacikaŭlenaść materyjalnaja. Daścihajecca hetaj zacikaŭlenaści pry pomačy h.zv. „premii za nabor“.

Pierad suśvietnaj vajnoju pracent vydavanaj premii za nabor asiahaŭ 10. U apošnija hady pracent hety skaraciŭsia, vahajučysia pamiž 3 i 5-ciu. Kooperatyŭny źjezd u Saksonii navat zabaraniŭ pavyšać jaho zvyš 5-cioch, majučy namier za košt premii pavialičyć abarotnyja srodki kooperacyi. Takoje imknieńnie źjaŭlajecca ciapier panujučym amal va ŭsich kooperatyŭnych rajonach i treba ličyć, što hetaje źjavišča vielmi metaadpaviednaje, bo tolki aščadžajučy salidnyja kapitały i puščajučy ich u abarot, kooperacyja moža raźvivacca i pamysna vieści baraćbu z pryvatnym kapitałam.

(d. b.) *A. F.*

ся табе, ня надта веру, каб мы справу давялі да мэты. За мала ёсьць нас, ды яшчэ такіх, што змагаюцца ў хаце з злыднямі. Вёска наша вялікая, але калі-б гэта зразумеў кожны. Не памногу, а было-б многа. Ды што-ж, колькі я ўжо нагаварыўся. Ведаю, што і ты дарма не сядзіш, больш за мяне тлумачыш, ды што-ж, яшчэ насьмяхаюцца. На якіх дваццаць можна спадзявацца.

Аляксей: Думаю, што знойдзецца больш.

Рыгор: Пабачыш на зборцы. А ўрэшце, ці варта склікаць зборку, як няма для каго?

Аляксей: Калі-б і яшчэ менш было, а зборку рабіць трэба. На зборцы будзе амаль што ня ўся вёска. Мы не такія вучоныя, каб добра ўмелі прамовіць людзям да сэрца, але прыедзе дэлегат. Кожны пачатак цяжкі, а яшчэ ў нас! Спачатку здаецца, што лягчэй камень праглынуць, як штось добрага між людзьмі зрабіць, але і капля вады камень прадлубае. Ня трэба траціць ахвоту, а прытым і сілы да працы.

Рыгор: Некаторыя кажуць:...што грошы даваць? Замнога іх там ужо набралася гэтых паўпанкоў і хочаць абдурыць сялян, зложым грошы, а пасьля нам зложуць хвігу пад нос!" Вось цемната, ды годзе! Што ім не гавары, усё адно. Кажу ім, што гэта ўсё будзе запісана ў судзе, што ані адзін грош не прападзе, але гдзе там!

Аляксей: Не папрабаваўшы, ня можам пакінуць справы. Ужо многа ёсьць вёсак, што маюць свае коопэратывы і добра ў іх разьвіваюцца, а пэўна, што і там спачатку ня было лёгка.

Рыгор: А найгорш—Галаваты. Вото-ж біты сабака! „Гэтыя малакасосы — кажа — зараз захочаць сьвет дагары нагамі перавярнуць, ды далёка ім яшчэ да таго, каб яны ў вёсцы заводзілі парадкі. Там у Янкеля цяпер вечна адбываюцца іхныя зборкі. Янкель зьнюхаў на што заносіцца, верціцца па ўсёй вёсцы. Кланяецца, каму можа. Цану на тавары абніжыў, па даўгі да нікога ня лазіць. Сваю шайку зьбірае. А найгорш, дык ужо з гэтым войтавым пісарам, Зьмітруком.

Аляксей: Няхай сабе. Спадзяюся, што ўсё будзе добра, і з гэтай надзеяй іду наперад. Ані Янкель, ані Галаваты, ані яго сынок нас не перамогуць, калі толькі мы ня зыйдзем з шляху. Сьвятло і праўда—цемру і вызыск перэмагчы мусяць! Ты вось лепш заўтра схадзі да Радзюка, каб ён нам даў хаты ў нядзелю на зборку, бо я абвесьціў не запытаўшы яго. Ды я пэўны, што ён пазволе.

Рыгор: Э, калі-б такія ўсе, як Радзюк,

Сельская гаспадарка.

Добры гной.

Жывём у такіх часох, калі ўсякае дакупліваньне чаго-небудзь у земляробскую гаспадарку, а тымбольш дакупліваньне штучных гнаёў сталася проста немагчымым. Наша-ж глеба ўзноў такая, што як не пагноіш, дык і ня зьберыш. Як-жа тады быць, каб неяк а ўтрымацца на гаспадарцы пры жыцьці, бо пэўным здаецца быць, што зданлівы надвыраб апошніх пару гадоў хутка міне і можа лёгка абярнуцца ў фармальную галадоўлю.

Пры такім стане рэчаў, воляй ці няволяй, трэба вярнуцца ў круг свае-ж собскае гаспадаркі і пашукаць, што-б там яшчэ можна было знайсьці і выкарыстаць. А ёсьць там нявыкарыстаны яшчэ належна гной з-пад жывёлы.

Не аднаму здасца гэта дзіўным: як? той гной, з каторым наш чалавек крутае ад дзяцінства і дзеда прадзеда, йшчэ нявыкарыстаны? —

Так, сапраўды так!

Бо пры тым абходжаньні з гноем, як гэта здараецца на кожным кроку ў нас бачыць, з яго ледзь-ня-ледзь астаецца толькі якаясь трэцяя часьць, а то й менш: — рэшта прападае безкарысна і бязсьледна. А гэта дзеля таго, што наш чалавек у большасьці выпадкаў ня ведае, не разумее, што ў гнаі мае першарадную вартасьць, што другарадную, а што ёсьць і проста бязвартасным.

Гной у сваім першабытным відзе, якім ён выходзе з-пад жывёлы, сусём няпрыгодны да гнаеньня, ён нават шкодны. Каб-жа гэтысамы гной стаўся здольным да свайго празначэньня — дакормліваць згаладалую зямлю — ён сам мусіць прад тым адпаведнаператварыцца, ці як прынята казаць — перапрэць. Сапраўды-ж пры гэтым ператвараньні гною адбываецца ня што іншае, як расклад арганічных (жывых) сучастак гною ў сучасткі неарганічныя, мінэральныя; бо неразложаныя сучасткі гною для зямлі і расьліны гэта тоесамае, што сырая страва для чалавека: прыняць, а тымбольш скарыстаць з яе ня можа.

Для разлажэньня ці для сьпяленьня гною патрэбны адпаведныя варункі, бо гэта сьпяленьне мусіць быць ані за скорае ані за павольнае. Як адно, так і другое бывае прычынай найбольшых стратаў на вартасьці гною і тут якраз крыецца сакрэт, чаму гнойная сіла нашага гною нявыкарыстана.

Першым варункам правільнага разлажэньня гною ёсьць шчыльнае ўтоптываньне

Гэта чалавек. Няграматны, але разумнейшы ад многіх граматных.

Аляксей: З часам усе гэтакія будуць. Калі пабачаць, што мы іх да дабра клічам, да агульнага і іх уласнага, усе пойдуць за намі. Тут вось што. Да нядзелі трэба пера гаварыцца з жанчынамі. Мы й забыліся аб гэтым. Ад іх вельмі многа залежыць. Не адна праклінае Янкеля з яго карчмой і крамай. Пашле мужа па соль, ці па што да крамы, а тут яму кум на сустрэчу, дык і пасядзяць сабе пры чарцы, а жонка чакае солі, а пасьля сама йдзе. Шмат нам жанчыны памогуць... Адно толькі, Рыгорка, мяне смуціць: за што па зборцы мы заложым краму. Паі*) многа ня прынясуць. Трэба грашэй, а гдзе іх да ліха ўзяць?

Рыгор: І я ўжо над гэтым думаў. Калі-б я быў самастойным гаспадаром, то ўжо неяк-бы выкруціў.

Аляксей: А ў мяне, як?.. Таксама!

Рыгор: Знаеш, брат, што я думаў, ды нават не адважуся табе сказаць. Ты з Насьцяю з хутара даўна знаёмы. Праўда?!

Аляксей: Толькі, што ты...

Рыгор: Э, не, не кажы гэтак! Я знаю, што ты таішся з каханьнем да яе, і знаю, што яна прападае за табой.

*) Пай гэта ўмоўленая складка ў коопэратыве. Г. Ш.

Аляксей: Тры гады мінула, як я быў там, на хутары. А праз той час не гаварыў з ёй, хіба добры дзень, ці добры вечар. Ды, людзі больш плятуць, як ёсьць у сапраўднасьці

Рыгор: Як-бы ты гэтак пагаварыў з ёй! Можа-б яна ў старога выенчыла пазычку. На гэткую справу!

Аляксей: Пацыганску ты мне радзіш? Ты пэўна хочаш, каб я на хвіліну прадаў сябе, сваё сэрца, за грошы для народнай справы?... Добра, сябе я магу прадаць. Але навошта я меў-бы завязаваць сьвет Насьці?... Ты ведаеш, якая яна! Я ніколі ня мог-бы ашуківаць яе, удаваць любоў, бо яна маёй ніколі ня будзе. Чуеш, Рыгор?! — Вось табе маё слова! І ведай, што тое, што людзі гавораць, што нібы я начамі на хутары прабываю, гэта ўсё няпраўда. Тры гады мая нага на хутары ня была. Чаму? — ты знаеш. Не хачу маме наперакор рабіць, бо мама добрая.

Рыгор: А я думаў...

Аляксей: Я прад табой за дзяўчыну бажыцца ня буду. Яна варта сто разоў лепшага ад мяне. Я знаю яе, як родную сястру. Восем гадоў там быў, як у сваёй хаце. А за гэтыя тры гады, хоць здалёку, але добра прыглядзіўся да яе жыцьця. Такой дзяўчыны ў цэлым сьвеце няма.

убіваньне яго, каб усярэдзіну даставалася якнайменш паветра (воздуху), бо пры разлажэньні гною працуюць бактэрыі, якія паветра ня любяць. — Другім варункам, які кіруецца да тэй-жа мэты, ёсьць вільготнае трыманьне гною. І ўрэшце трэцім варункам ёсьць, каб распускныя ў вадзе сучасткі гною не выпаласківаліся ў спод. З гэтага вынікае, што зложаны гной мусіць быць забясьпечаны стрэшкай ад дажджоў (сонца таксама абніжае вартасьць гною) і мець непрапускны спод (з гліны).

Пытаньне цяпер, гдзе і як найлепш трымаць гной, каб ягонае сьпяленьне адбывалася як найлепш? — У нашых кліматычных умовах заданьне гэта найлепш выконвае хлеў, які аднак мусіць быць адпаведна глы бокі, мець непрапускны спод і памагчымасьці вісячыя жлабы. Побач з гэтым спатыкаецца трыманьне і сьпяленьне гною на адумысным гнойнішчы, забясьпечаным зьверху (стрэшка), зьнізу (непрапускны спод) і з бакоў, або час ад часу вывозіцца і складаецца на ўзгорку на полі; у гэтым апошнім выпадку надта добра памагае аблажэньне утаптанай гурбы гною з усіх бакоў пластам непрапускной гліны.

Будзь зложаны гной да дасьпяваньня ў хляве, ці на гнойнішчы, ці ўрэшце на кучах у полі, заўсяды першараднае значэньне мае, чым гэты гной быў перакладаны, ці прасьцей кажучы, якая была падсьцілка. Заданьнем падсьцілкі ёсьць ня толькі затрыманьне ад выпаласківаньня з гною ўсякіх распускных сучастак, але і дапамога бактэрыям у працы над раскладаньнем арганічнай масы гною ў сучасткі неарганічныя. Другараднае толькі значэньне мае подсьцілка як спосаб да ўтрыманьня ў парадку (чыстай) гадаванай жывёлы. — Усе істотныя вымогі падсьцілкі найлепш здаваляе торф, які здольны ўбраць у сябе ў 5—6 разоў больш усякай плыні, чым важыць сам. Да таго-ж сама маса торфу дадае ў зямлю шмат цэннага азоту.

Добрай падсьцілкай ёсьць таксама сухое лісьцё з-пад дрэваў. Але тут трэба памятаць, каб не пакрыўдзіць лес, для якога ўласнае лісьцё ёсьць адзіным угнаеньнем.

Трэцяй з колеі падсьцілкай ёсьць салома з збажжавін. Ня мае яна, праўда, гэткай здольнасьці ўбіраць у сябе плынныя сучасткі гною, як гэта робіць торф, ці нават сухое лісьцё, але мае прад імі тое пяршынство, што знаходзіцца пад рукой у кожнай гаспадарцы. Адна бяда, што ўжываньне саломы, як падсьцілкі, ў нас найчасьцей ня сусём уласьцівае: нашы людзі ўжываюць на падсьцілку салому цэлую, у найлепшым разе — пераціраную ў малатарні. Гэткую салому надта цяжка шчыльна ўлажыць і ўтаптаць, а ўтаптаную — яшчэ цяжэй пасьля растрасаць па полі. Апрача таго доўгая салома звычайна ня гэтак лёгка паддаецца раскладу і гной засьцелены гэткай саломай ня хутка прэе... Усе гэтыя і шмат іншых труднасьцяў адпадаюць, калі замест цэлай саломы на падсьцілку ўжыць саломы рэзанай на доўгую

Рыгор: Дзіўны ты, Аляксей! Сам расхвальваеш,а дзяўчыны ня хочаш. Неяк дзіўна...

Аляксей; Знаю, што я для цябе дзіўны. Насьця багатая, праўда, але і не глядзе ла-б на тое, што я бяднейшы. І знаю, што стары Ахрэм нічога-б ня меў проці мяне. Ды ты знаеш, які з мяне гаспадар. Ты сяньня колькі разоў мне падкошываў. Табе касьба ніякай мукі не спраўляла, а з мяне ліўся пот. А стацца для кагось цяжарам, адразу наймаць парабкоў, я не хачу. Дзеля гэтага я нават ніколі не падумаю, каб яна была мая.

Рыгор: Дзіўна!... Дык ты яе ня любіш?

Аляксей: Як сястру, больш. І калі мне ў думках стаіць дзяўчына, якой павінны быць усе дзяўчаты, то гэтаю дзяўчынай ёсьць Насьця.

Рыгор: Ну, то хай-жа цябе ліха возьме з тваёю Насьцяю! Я цябе не разьбяру' І любіш і ня любіш. І прыгожая над усіх' і добрая і жаніцца ня хоча. Ты свайго дзівацтва з малых яшчэ гадоў не пакідаеш. А аб грашах на коопэратыву ты ўсё-ж можаш з ёй пагутарыць.

Аляксей: Як будзе магчымасьць, папрабую. Толькі ня так, як ты кажаш.

Рыгор: Дзеля мяне, як хочаш, але грашэй трэба, бяз іх мы ня дойдзем да ладу, а яшчэ асьмешымся. Ну ідзі-ж на хутар, калі клікалі. Хіба не дарма. (*Пайшоў*).

ЗЬЯВА 3.

Аляксей: Дабранач! — (*Сам*) І чаго гэта мяне клікаў стары Ахрэм? Тры гады я з ім не гаварыў; неяк прыкра мне йсьці. Як маці выйшла замуж, то ня мог стары з гэтым прымірыцца. І добра ён радзіў: „Ня йдзі, Марыся, замуж, казаў, бо другі муж ня будзе ўжо такі, як Іван"— ды й мама цяпер каіцца, што не паслухала і сорамна ёй паказацца дзеду на вочы. Загневаўся стары на нас. Абмінала мама хутар, абмінаў і я. Сумны дакор павеіў на нас з хутара, толькі Насьця, здаецца, такаясамая, як была.— Але што гэта дзед задумаў? Чаго яму ад мяне трэба?... Ці можа будзе дапамінацца доўгу?.. Ды не! — Раней бы дамагаўся. У яго й так досіць дастаткаў, ды грошай (*чухаецца ў галаве*). Нялоўка мне йсьці туды, але трэба. (*Ідзе ў старану кладкі*).

(*д. б.*)

сечку, напр. на 12—15—19 стм.(на 1—2 далані). Гэткае рэзаньне саломы на сечку, праўда, зьвязана з пэўнымі коштамі, якія аднак аплачваюцца тым ужо толькі, што гэткай рэзанай саломы выходзіць на падсьцілку значна менш, як доўгай, цэлай.

Гэтых некалькі ўваг трэба добра запамятаць цяпер на пачатку зімы, каб набіраны за зіму гной да вясны правільна дасьпяліць і разумна застасаваць. Раз ужо лёс чалавека зьвязаў з гноем, дык трэба ўмець з ім правільна абыйсьціся, бо гной з-пад жывёлы ёсьць найлепшым з усіх гнаёў.

С. Я—ч.

Haspadarčaja chronika.

Vystaŭka tkanin. U časie sioletniaha tradycyjnaha Kaziukovaha kirmaša ŭ Vilni (4.III.1933) prajektujecca adčynieńnie vystaŭki tkanin-samadziełaŭ, jakimi hetak słaviacca našy biełaruskija ziemli. Na dobry ład była-b heta akazija vykaz.ć prad śv etam, čaho varty hałovy i ruki našych „ciomnych" biełaruskich tkalaŭ. Tolki ci chopić advahi ŭ haspadaroŭ vystaŭki pakazać, što heta praca ruk imienna biełaruskich, a nia čyich inšych?!

Krychu ličbaŭ z małačarstva na biełaruskich ziemlach. Pavodle spravazdačy na kaniec 1931 h. na abšary Vilenskaha i Navahradzkaha vajavodztvaŭ było 59 sajuznych kooperatyŭnych małačarniaŭ, z jakich tolki małačarni ŭ Tupalščynie i Plisie hnalisia mašynaj: rešta — ručnyja. Siabroŭ u sajuznych małačarniach u Vilenščynie było 6.954, a ŭ Navahradčynie — 4.202; karovaŭ-ža prypisanych da kooperatyvaŭ: u Vilenščynie 13.561, a ŭ Navahradčynie 6.873. Na adnu małačarniu ŭ Vilenščynie prypadaje 206 siabroŭ i 411 karoŭ, a ŭ Navahradčynie — 191 siabra i 3 2 karoŭ. Ličba karoŭ prypisanych da małačarskich kooperatyvaŭ u pracentach vynosić u Vilenščynie 5.2, a ŭ Navahradčynie — 2.9. Najvyžšy pracent prypadaje na Dzisienski (11.9) i Brasłaŭski (8.2) paviety.

Dastavili i pierapracavali małaka najbolš hetyja małačarni: Plisa — 1 017.0 0 litraŭ, Tupalščyna — 836.807 l. Parfienava — 748.742 l., Dokšycy (z Vincentovam) — 791 703 l....

Košty vyrabu ŭ paasobnych małačarniach vahalisia pamiž 10.93 prac. da 78.39 prac. ad abarotu i na 1000 litraŭ vynosili ad 18 zł. 94 hr. da 114 zł 17 hr.

Ahulnaja ličba pierapracavanaha małaka vynosiła 11.495 884 litraŭ Za heta małako dastaŭcom było vypłačana ŭ Vilenščynie 1.010.985 zł., a ŭ Navahradčynie — 405.880 zł. Za tłušč z adnaho litra małaka ŭ Vilenščynie płacili 12.25 hraša, a ŭ Navahradčynie — 12.22 hraša.

Lojalnych da sajuzu małačarniaŭ, h. zn. takich, katoryja pradavali praz hety sajuz svajo masła, było tolki 55.4 prac.

Čužymi rukami tolki žar zahrabać. U prošłym miesiacy adbyŭsia ŭ Varšavie h. zv. „Tydzień Rolniczy", kudy vazili „na pakaz" i našych ludziej. Ale tolki „na pakaz", bo kali staršyni inšych delehacyjaŭ, napr. z Paznanščyny, damahalisia sapraŭdy račovych dla siabie palohkaŭ, dyk staršynia delehacyi z našych ziemlaŭ, polski asadnik i pasoł Ul. Kaminski (ci na kaho lepšaha było ŭžo tak trudna ŭzdabycca?), nie znajšoŭ ničoha pilniejšaha i važniejšaha, jak bicca ŭ adčynienyja dźviery i dakazyvać, što „dobrobyt gospodarczy na Wschodzie jest podwaliną organizacji tamtejszej polskości" i što treba dziela taho „dbać o zwiększenie stanu posiadania i kultury polskiej".

Vyhladała-b [z hetaha, što polskija pany, uradaŭcy i asadniki majuć u nas jašče mała: jak budzie žyć naš mužyk, kali heta „posiadanie" i „kultura" sapraŭdy jašče pavialičacca? A da hetaha, jak vidać, kirujucca „našyja dabradziei". — Čas najvyšejšy, kab našy ludzi paznali ŭreščie „vaŭkoŭ u aviečaj skury" i adviarnulisia da ich zadam.

Krok nazad. Ad Novaha 1933 ha Hodu ŭvachodzić u siłu pa całaj siańniašniaj Polščy novy zakon ab tavarystvach z 27.X.1932 h. Hety zakon viedamy z taho, što jon ahraničvaje i biez taho nievialikuju svabodu raźviccia kooperatyvaŭ, kali jany zajmajucca dziejnaściaj kulturna praśvietnaj i paddaje hetkija kooperatyvy pad nadzor pal.cyi, tady jak dahetul kooperatyvy padlahali sudu i prakuroru biezpasiaredna.

Jak heta adabjecca na žyćci i roźvitku kooperatyvaŭ, — dadumacca nia ciažka: kulturna-praśvietnaja dziejnaść, jakaja jošć fundamentam, dušoj dziejnaści haspadarčaj u kooperatyvie, nia budzie ciapier mahčy narmalna raźvivacca, bo patrebnaja da hetaha pryvatnaja inicyjatyva pad palicyjnym nadzoram nikoli nie razaŭjecca. A biaz hetaha i haspadarčaja dziejnaść „siadzie makam".

Słovam, novy zakon heta sapraŭdy „śpicy ŭ kalaścy". Dzivicca tolki prychodzicca, što polski ŭrad, kab vybryści z kryzysu, zamiest pabudžać pryvatnuju inicyjatyvu, zamarožvaje jaje ŭ zimnych abojmach palicejskich revizijaŭ i nakazaŭ. Zažyvuć hetaha ŭsie kooperatyvy, a kooperatyvy niapolskija peŭnie-ž ŭ pieršuju čarhu. — U hetaj spravie ŭžo šmat pisali i polskija kooperatyŭnyja hazety i jany nazyvajuć novy zakon **krokam nazad**: a što ž majem na heta skazać my, biełarusy?

Hrošy — niahrošy. Ad 1.I 33 h. pierastajuć być praŭnym płatničym srodkam (hrašmi) siarebranyja (nia niklovyja!) manety adnazłotki, a ad 31.I.33 h. — i siarebranyja dvuzłotki, vydanyja ŭ 1924 (nie 1925) h. — Paśla hetaha času, da 1.I.35 h. nazvanyja manety buduć prymacca jšče tolki ŭ kasach skarbovych i ŭ addziełach Banku Polskaha.

Paštovaja skrynka.

Kondratu—za vysłanuju knižku naležyć z Vas jašče 1 zł. 65 hr., jakija pierašlecie dałučanym da knižki blankietam P.K.O. Nr. 180.485. **St. Błažuku** — źmiaścić nia možam, bo nie padajecie faktaŭ, cyfraŭ, imionaŭ. Hetkija karespandencyi nia majuć dla nas vartaści. Padpisnuju płatu, kali nia možacie sami — heta-ž tak mała — zapłaciecie ŭ składčynu. Darma hazety vysyłać nia možam, bo i nam nichto i ničoha darma taksama nie daje. Zrazumiejcie-ž heta! **M. H.** — Škadujem, ale źmiaścić nia možam, bo heta było-b tolki „hieneralskaje harcavańnie", a nam patrebna drobnaja, čornaja praca, jakoj za nas nichto nia zrobić i biez jakoj nielha padumać kooperatyŭnaha budaŭnictva. **K. Matuseviču** — tak składasia, što musili jšče Vašu pracu adłažyć da dalšych numaroŭ. Jak idzie tam zbor padpisnoj płaty? **Kazču, B-mu i S-cy** atrymali, pry mahčymaści skarystajem. **Bibliotecy V. Š. H. ŭ Varšavie i Misunie M.** —časopiś budziem vysyłać. **M. Putryč i Al. Kirenia** —probnyja numary pasyłajem; dalšaja vysyłka budzie zaležyć ad taho, jak skora pryšlecie hrošy na padpisku. **Dr. Myślickamu** — probny numar vysyłajem; papiarednija, jak i nastupnyja numary vyšlem tolki pa atrymańni hrašej na padpisku.

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ.

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 6—10.

Да беларускіх коопэратываў.

Наша часопіс „Самапомач“ у першую чаргу ёсьць часопісяй коопэратыўнай і як такая можа зьмяшчаць усякія абвесткі, якія ўставова і статутова забабязываюць кожную коопэратыву.

Дзеля гэтага абавязкам кожнай коопэратывы ёсьць даваць усякія абвесткі толькі і выключна ў сваю беларускую коопэратыўную часопісь „Самапомач“.

Памятайце аб гэтым кожны, хто прыступае да арганізаваньня коопэратывы новай і ўстаўляйце адпаведную пастанову ў свой статут. Тыя-ж коопэратывы, якія ўжо існуюць, прыймеце адпаведную пастанову і правядзеце яе праз Агульны Сход сябраў Вашае коопэратывы.

Беларускія коопэратывы гуртуйцеся кала беларускай часопісі.

Рэд. „Самапомачы“.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ